# Брыгіцкі кляштар

*Калнін, В.В. Брыгіцкі кляштар / В.В. Калнін // Калнін, В.В. Гродна ў дыялогу стагоддзяў: альбом / В.В. Калнін. - Мінск: Кавалер, 2008. - С. 94-101.*



Нешырокая вуліца, якая вядзе ад былога рынку (Савецкай плошчы) міма фарнага касцёла, забудаваная старымі 2-3-павярховымі дамамі. Вузенькі тратуарчык і транспартны рух не даюць асабліва аглядацца па баках; заўважаюцца толькі балкончыкі над галавой і адмысловыя дзверы шматлікіх крамаў і крамікаў. Калісьці вуліца называлася Гандлёвай, ці Купецкай, зараз носіць імя К.Маркса.

Праз два ці тры кварталы позірк натыкаецца на вежачку накшталт рэкламнай тумбы, але чыстую, бялюткую, без аб'яў. Паабапал сцены, таксама белыя, цягнуцца на цэлы квартал. Раптоўная скразная бель гэтак уражвае, што не адразу заўважаеш вышэй ад яе "прыгажуню за плотам" - брыгіцкі касцёл. Незвычайнае спатканне з цудоўнай архітэктурай, незвычайнасць назвы "брыгіцкі", незвычайнасць вуліцы, якая мела таксама і гэтую назву, - мімаволі выклікаюць вялікую цікаўнасць.

Экзатычная назва паходзіць з Паўночнай Еўропы, дзе Брыгіта, дачка нейкага князя, заснавала ў 14-м стагоддзі манаскі жаночы ордэн. Прымалі ў яго пераважна дзяўчат з заможных і магнацкіх сем'яў, чым забяспечвалі ордэн значнымі фінансавымі сродкамі. На тэрыторыі Беларусі акрамя гродзенскага падобны кляштар быў толькі ў Брэсце, абодва ліквідавалі ў першай палове пазамінулага стагоддзя. Але ў Гродне некалькі манашак-брыгітак пратрымаліся да пачатку 20-га стагоддзя, калі іх далучылі да назарэцянак.

Перад апошняй вайной кляштар цалкам ліквідавалі, у будынку пачалі апекавацца хворымі, а касцёл пакінулі на волю лёсу. Ад былой

раскошы заставаліся толькі цьмяныя ўспаміны, якія хутка ператвараліся ў паданні з прывідамі. Напрыклад, прычыну закрыцця кляштара тлумачылі выкраданнем прыгажуні-манашкі савецкім палкоўнікам. Кажуць, у час выкрадання за сценамі чуліся страшэнныя енкі і крыкі і быццам дагэтуль яны гучаць па начах.

Паданні паданнямі, але “прывіды” кляштара сапраўды пачалі аб’яўляцца праз два дзесяцігоддзі пасля зыходу адсюль апошняй божай прыслужніцы. Праўда, адзіны “прывід” нікуды не знікаў, а стаіць у двары пасівелы больш за чатыры вякі. Гэта драўляны лямус - гаспадарчая пабудова, адзіны на Беларусі жывы помнік народнага дойлідства. У 1966 годзе з сутарэння касцёла былі выцягнуты аж цэлых тры “прывіды” - партрэты заснавальнікаў кляштара Крыштофа і Аляксандры Марыяны Весялоўскіх і іх прыёмнай дачкі Грызельды Сапегавай. Апошняя памерла ў 1633 годзе, і мяркуецца, што дзеля ўшанавання яе памяці быў створаны кляштар. Усе тры партрэты пры іх раскрыцці сапраўды мелі “прывідны” характар і былі тэрмінова адвезены на аднаўленне ў Ленінград, у Рускі музей. Зараз яны захоўваюцца ў Мінску.



*Лямус у двары кляштара, 17-е стагоддзе*

Трэцяе з’яўленне “прывідаў”, нават не трох, а цэлага шэрагу, адбылося праз дзесяць гадоў у часе рэстаўрацыі фасадаў касцёла. Пад шматразовымі афарбоўкамі фрыза раскрыліся дробныя фрагменты сграфіта - тынкавага графічнага жывапісу ў два слаі: белага і чорнага ў выглядзе фантастычных марскіх жывёлін і акрыленых тварыкаў. Фрыз цалкам аднавілі і толькі адну частку на галоўным фасадзе пакінулі ў некранутым “прывідным” стане.